Ліда-Фара

Аўтар: Паводле архіва Гродзенскай дыяцэзіі
26.06.2016 00:00



Касцёл Узвышэння Святога Крыжа Дэканат Ліда Прывілей на заснаванне ў Лідзе парафіяльнага касцёла быў падпісаны каралём Ягайлам 17 ліпеня 1387 г. у лідскім замку. Але першы драўляны касцёл, пабудаваны на падзамчышчы, згарэў у 1392 г. падчас нападу крыжакаў. Адбудаваную святыню 3 чэрвеня 1397 г. асвяціў пад падвойным тытулам св. Францішка і Святога Крыжа першы віленскі біскуп Андрэй Васіла. Апекаваліся касцёлам францішканцы. У 1406 г. касцёл быў зноў спалены пры нападзе на горад смаленскага князя Юрыя Святаслававіча, а ў 1414 г. адноўлены і асвечаны пад трайным тытулам Найсвяцейшай Панны Марыі, Усіх Святых і Святога Крыжа. У 1466 г. францішканцы пакінулі Ліду. † 7 ліпеня 1616 г. фундуш лідскай Фары пацвердзіў кароль Жыгімонт І. Падчас “маскоўскага нашэсця” старажытная святыня была знішчана. Апошні драўляны будынак Фары быў узведзены намаганнямі кс. Рэбеўта і асвечаны ў 1674 г. біскупам-суфраганам Мікалаем Слупскім. У 1644 г. пры касцёле была заснавана альтарыя.

Ліда-Фара

Аўтар: Паводле архіва Гродзенскай дыяцэзіі
26.06.2016 00:00



